тэксты чужых лексічных адзінак: ***Дастойных** было і ёсць з каго выбіраць* ("Кліч Радзімы", 2010, № 32); П*ерамогуць толькі* ***дастойныя*** *ўдзельнікі* ("Чырвоны прамень", 2010, № 25); ... *Але і ў гэтай сітуацыі ён паводзіў сябе* ***дастойна*** ("Лепельскі край", 2010, № 12); *На працягу* ***раждзественскіх*** *святаў і Новага года дзеці адчувалі сябе шчаслівымі* ("Веснік Глыбоччыны", 2010, № 4); *Рэйд "Сям'я без* ***насілля****"* ("Веснік Глыбоччыны", 2011, № 86); *Уласная кватэра ці дом.* ***Здорава!*** ("Веснік Глыбоччыны", 2011, №86). Прыметнік *дастойны* і прыслоўе *дастойна* не павінны ўжывацца ў літаратурнай мове. У прыведзеных кантэкстах варта было выкарыстаць словы *годны(годна)* або *варты.* Замест не характэрнага для нашай мовы старaславянізма *раждзественскі* трэба было ўвесці ў кантэкст прыметнік *калядны*. А *Сям'я без* ***насілля*** *– сям'я без* ***гвалту****; Уласная кватэра ці дом.* ***Здорава!*** *– Уласная кватэра ці дом.* ***Цудоўна!*** І тады мы мелі б сапраўды беларускі дыскурс.

**Заключэнне.** Такім чынам, прааналізаваны матэрыял паказвае, што для рэгіянальнага друку Віцебшчыны праблема захавання культуры мовы папранейшаму надзвычай актуальная. Памылкі дапускаюцца на розных моўных узроўнях. І звязана гэта, у першую чаргу, з няўважлівым стаўленнем да беларускага слова. Недастатковая прафесійная падрыхтоўка аўтараў – толькі частка праблемы. Бо калі чалавек думае па-руску, а потым ліхаманкава перакладае фразу на беларускую мову, то і атрымліваюцца штучныя, калькаваныя сказы, нярэдка з элементамі "трасянкі". Таму толькі свядомае выкарыстанне журналістамі нашай мовы ў штодзённай камунікацыі, у розных сферах зносін будзе садзейнічаць павышэнню моўнага майстэрства, дапаможа пазбегнуць памылак і павысіць культуру маўлення сродкаў масавай інфармацыі.

Спіс літаратуры


1. Сцяцко, П. Культура мовы / П. Сцяцко. – Мінск. – 2002.
2. Янкоўскі, Ф.М. Само слова гаворыць / Ф. М. Янкоўскі. – Мінск. – 1986.


## ВОБРАЗ РОДНАГА КРАЮ Ў ТВОРЧАСЦІ СУЧАСНЫХ ПІСЬМЕННІКАЎ ВІЦЕБШЧЫНЫ І ЛАТГАЛІІ


*В.Ю. Бароўка*
*Віцебск, УА "ВДУ імя П.М. Машэрава"*


Адно з цэнтральных месцаў у творчасці пісьменнікаў Віцебшчыны і Латгаліі заўсёды займаў вобраз роднага краю. Мэта дадзенай працы – выявіць характэрныя рысы рэпрэзентацыі свайго рэгіёна ў творчасці сучасных пісьменнікаў Віцебшчыны і Латгаліі, звярнуць увагу на наяўнасць і дэтэрмінацыю тыпалагічных сыходжанняў у працэсе мастацкага ўзнаўлення сваіх геаграфічных рэалій пісьменнікамі Беларусі і Латвіі.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам для даследавання сталі творы сучасных пісьменнікаў двух рэгіёнаў, у рабоце выкарыстоўваюцца прыёмы канкрэтнагістарычнага, фенаменалагічнага і дэскрыптыўнага аналізу.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Пісьменнікі Віцебшчыны пры ўзнаўленні характэрных рыс сваёй зямлі пастаянна акцэнтавалі, што Падзвінне – край азёр і рэк. Да месца прыгадаць знакамітыя радкі з верша Рыгора Барадуліна "Вечалле":

Спадчыннае возера маё,
Вечнасцю прывечанае
Вечалле [1, 21].



Репозиторий ВГУ

У творчасці аўтараў Латгаліі дамінантнай рысай геаграфічнай прасторы практычна заўсёды выступала рака Даўгава. Даўгава – адзін з самых частых вобразаў у вершаванай творчасці класіка латышскай літаратуры Яна Райніса, дзіцячыя гады якога прайшлі ў Латгаліі. Як вядома, гэта рака працякае і па тэрыторыі Беларусі, таму не выпадковым быў зварот да яе такіх пісьменнікаў Віцебшчыны, як Арцём Вярыга-Дарэўскі, Тадэвуш Лада-Заблоцкі, Вацлаў Ластоўскі, Пятрусь Броўка, Тарас Хадкевіч і іншыя. Адзін з сучасных пісьменнікаў Латгаліі Станіслаў Валодзька, беларус па паходжанні, у сваіх вершах падкрэслівае, што ў яго свядомасці непарыўна звязаны Дзвіна і Даўгава.

Сучасныя пісьменнікі Віцебшчыны найперш акцэнтуюць старажытнасць гэтага краю. Пейзаж рэгіёна ў іх узнаўленні не толькі вясковы, хаця вясковая "прапіска" Віцебшчыны са старонак літаратурных твораў ніколі не знікала, але і гарадскі. Пры гэтым неабходна зазначыць, што Полацк у творчасці аўтараў Віцебшчыны згадваецца намнога часцей, чым Віцебск. Гэта па-свойму заканамерна, бо Полацк – самы старажытны і самы вядомы горад гэтага рэгіёна. Так, для лірычнага героя верша-прысвячэння "Полацку" Алега Салтука Полацк – горад-рэальнасць і адначасова гістарычны і мастацкі помнік:

Век за векам няспешна ідзе
І вядзе несканчоныя войны…
Дзе твой след, Усяслаў Чарадзей,
Княжа Полацкі вольны?

Я стаю над блакітнай Дзвіной,
Чую голас я шматвяковы.
"Смелы целам" і "вольны душой" –
Аб табе адклікаецца "Слова" [2, 80].

Нярэдка той ці іншы геаграфічны аб'ект Віцебшчыны згадваецца ў сувязі з вядомай асобай: Полацк у сувязі з Сімяонам Полацкім і Еўфрасінняй Полацкай ці Усяславам Чарадзеем, Орша – у сувязі з Уладзімірам Караткевічам, Ушаччына – у сувязі з цэлай плеядай знакамітых пісьменнікаў, гонару беларускай літаратуры. Паказальны ў гэтым плане верш Анатоля Канапелькі "Гасцінна да сябе паклікала…".

У многіх творах пісьменнікаў Віцебшчыны паэтызуюцца рэкі. Малыя рэкі кшталту Дзісёнкі ў Міхася Райчонка, Мядзелкі ў Ігара Пракаповіча, Ушачкі ў Рыгора Барадуліна, Мёрыцы і Волты ў Сяргея Панізніка – элемент пейзажу і адначасова напамін пра жыццёвы выток канкрэтнага чалавека.

Ананімная, і не толькі, "вясковая" геаграфія – адметная рыса геапаэтыкі пісьменнікаў Віцебшчыны. Кароткая гісторыя сучаснай Аршаншчыны ўвасобілася ў прозе Янкі Сіпакова, Пастаўшчыны – у паэзіі Ігара Пракаповіча. "Сляды" вёсак услед за Петрусём Броўкам, Еўдакіяй Лось, Рыгорам Барадуліным занатавалі Генадзь Казак, Алесь Шпыркоў, Анатоль Канапелька і многія іншыя аўтары.

Па-свойму заканамерна, што пісьменнікі гэтага рэгіёна мастацкімі сродкамі імкнуцца ўшанаваць памяць пра вядомых дзеячаў культуры, бо Віцебшчына падаравала Беларусі і свету шмат знакамітых асоб. Так, Навум Гальпяровіч у вершы "Сімяон Полацкі. Вясна 1664 г." – паспрабаваў пункцірна паказаць гарадскія рэаліі і душэўны стан "вучонага манаха", які адпраўляецца ў Маскву. Патрыятычны пафас дзейнасці Сімяона Полацкага і Еўфрасінні Полацкай раскрываўся ў вершах Аркадзя Нафрановіча. Вершы, прысвечаныя знакамітым землякам (Браніславу Эпімах-Шыпілу, Зінаідзе Канапельцы, Уладзіміру Паўлаву,

Рэпазіторый ВДУ

Васілю Быкаву, Рыгору Барадуліну, Еўдакіі Лось, Уладзіміру Арлову, Давіду Сімановічу, Генадзю Бураўкіну, Валерыю Атрашкевічу, Марыі Баравік), – прыкметная частка літаратурнай спадчыны Анатоля Канапелькі. Асобная старонка ў паэзіі віцебскіх аўтараў – шматлікія вершы, напісаныя ў гонар Уладзіміра Караткевіча і яго літаратурнай спадчыны.

Стварэнне пейзажнага і сацыякультурнага вобразаў памежжа ўласціва паэзіі Сяргея Панізніка. Гэты аўтар пастаянна звяртае ўвагу на падабенства ландшафту, клімату двух рэгіёнаў. У адным з вершаў ён напісаў пра гэтыя мясціны:

Згінаецца Дзвіна тут у падкову,
І трубіць бор у старажытны рог[3, 80].

У творчасці сучасных пісьменнікаў Латгаліі найперш увасабляецца гарадскі пейзаж (Станіслаў Валодзька, Яўгеній Голубеў, Фаіна Осіна, Анастасія Сазанкова). Латышскі горад у іх мастакоўскім асэнсаванні – гэта спалучэнне розных архітэктурных і этнакультурных традыцый. Геаграфічная прастора Латгаліі ў рэпрэзентацыі пісьменнікаў гэтага рэгіёна ўрбанізаваная. Любімая пара года для большасці аўтараў Латгаліі – восень, калі прырода набывае яркія фарбы. Латгалія для пісьменнікаў гэтага рэгіёна – радзіма Яна Райніса і прытулак беларускай інтэлігенцыі на пачатку XX стагоддзя (Станіслаў Валодзька); радавое гняздо графаў Плятэраў (Яўгеній Голубеў); куток, які яшчэ чакае свайго сапраўднага гістарычнага і мастацкага адкрыцця (Фаіна Осіна); адначасова сонечная і змрочная, асабліва змрочная восенню, зямля, пейзаж і лёс якой пастаянна нагадваюць Беларусь (Анастасія Сазанкова).

**Заключэнне.** У імагалогіі пісьменнікаў Віцебшчыны і Латгаліі заўважаюцца пэўныя тыпалагічныя сыходжанні на ўзроўні зместу і формы ў мастацкай рэпрэзентацыі сваіх рэгіёнаў. Гэта адлюстраванне ландшафту з яго атрыбутыўнымі, паводле аўтарскіх уяўленняў, параметрамі; апісанне знакавых рыс агульнавядомых ці малавядомых геаграфічных аб'ектаў. На ўзроўні зместу абодва рэгіёны паказваюцца краем азёр і рэк. Часцей за ўсё вобраз рэгіёна ўвасабляецца ў лірычных творах, паколькі лірыка як род літаратуры дазваляе прама і непасрэдна выявіць эмоцыі суб'екта маўлення, перадаць яго настрой, светаадчуванне. Пэўныя тыпалагічныя сыходжанні на ўзроўні зместу і сістэмы вобразаў дэтэрмінаваныя найперш падабенствам ландшафту і клімату Латгаліі і Падзвіння. Разам з тым яны грунтуюцца і на псіхалагічнай аснове, паколькі вобразы роднага краю ствараюцца людзьмі так званага пераходнага часу. Стварэнне вобраза роднага краю ў слоўным мастацтве мае не толькі эстэтычнае вымярэнне, але і прыкладное, інфармацыйна-пазнавальнае. У гэтым сэнсе плён імагалогіі можна выкарыстоўваць у якасці ілюстрацыйнага матэрыялу ў галіне культурнага турызму, акрамя таго, высокамастацкая і этычна-карэктная імагалогія садзейнічае ўзаемаразуменню паміж народамі.

Спіс літаратуры

1. Барадулін, Р. Вечалле : кніга паэзіі. – Мінск : Маст. літ., 1980. – 336 с.
2. Дзвіна : Віцебшчына літаратурная. – Мінск : Маст. літ., 1992. – 334 с.
3. Панізнік, С. Стырно : вершы / С. Панізнік. – Мінск : Маст. літ., 1989. – 134 с.

Рэпазіторый ВДУ